**Наталля Заяц**

## З небыцця – у вечнасць

Для пісьменніка важна, каб набытак яго душы стаў набыткам многіх: падказанае яму небам слова абавязкова павінна быць перададзена іншым. Ужо больш за дзесяцігоддзе наш выбітны сучаснік Васіль Зуёнак агучвае свае паэтычныя думкі, размаўляе з чытачом толькі праз газетныя і часопісныя публікацыі твораў. Падборкі вершаў (а таксама проза) рэгулярна з'яўляюцца ў друку, але з 1995 года – з часу выхаду зборніка "Пісьмы з гэтага свету" (пазней былі яшчэ два тамы выбранага) – не было ніводнай новай арыгінальнай кнігі аўтара, які плённа піша і, галоўнае, напісанае ім заслугоўвае таго, каб называцца Паэзіяй. Чаму так адбываецца? Пытанне, хутчэй, рытарычнае, і пошукі адказу на яго скіроўваюць да сфер, далёкіх ад мастацтва…

Тым не менш новая кніга Васіля Зуёнка існуе. Дакладней, існуе яе электронная версія: каля тысячы (!) твораў 1996–2006 гадоў, па аўтарскім вызначэнні, "вершы сутоку тысячагоддзяў", сабраныя разам, утвараюць вялізны том пад назвай "Азірнуўшыся, не скамянець". На жаль, пагартаць яго старонкі аматары паэзіі не маюць магчымасці, аднак, нягледзячы на "віртуальнасць" гэтага збору вершаў (будзем спадзявацца – часовую), пра яго варта гаварыць, і размова не стане абстракцыяй: шматлікія творы знаёмыя шырокай аўдыторыі па перыёдыцы. Частка вершаў нідзе не друкавалася, таму ёсць патрэба і нагода анансаваць пакуль што невядомы мастакоўскі наробак В.Зуёнка.

Загаловак кнігі – алюзія на гісторыю са Старога Запавету – прадвызначае яе сэнсавую дамінанту: строгі і праўдзівы погляд на свет і сябе ў свеце, падсумаванне зробленага за пэўны жыццёвы адрэзак, споведзь сабе самому.

> Азірнуўшыся, не скамянею:
> Сам пажаў, што – сам жа – пасеяў.
> І ні ўдачы сваёй, ні віны
> Не ўступлю і за тры цаны.
> І ніхто: ні Бог і ні людзі –
> Так, як сам, мяне не асудзіць…[1]

У зборніку развіваюцца і паглыбляюцца галоўныя тэмы і матывы лірыкі В.Зуёнка. Да прыкладу, анімістычнае ўспрыняцце рэчаіснасці, пазначанае яшчэ ў знакамітым вершы "Ніхто не пачуў" з першага зборніка "Крэсіва" (1966), выяўляецца ў шматлікіх новых творах. Рэцэпцыя наваколля ў творчасці паэта адметная найперш увагай і чуйнасцю да, на першы погляд, нязначнага і незаўважнага, што адухаўляецца і ўспрымаецца як таямніца, не менш загадкавая і неспазнаная, чым асобны чалавек і цэлы Сусвет ("Рабіна…", "Ва ўсім загадка, тайнапіс…", "Што імклівы палёт сусветаў…"). Лірычны герой – а ў паэзіі В.Зуёнка ён амаль заўсёды тоесны асобе аўтара – цесна знітаваны з прыродай, адчувае сябе яе часцінкай: "Што

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бяседы, што вечарынкі – / Я даўно за сабою прыкмеціў: / Мне хапае адной травінкі, / Каб не быць адзінокім у свеце…” (“Адзінота, самота, згрызота…”). В.Зуёнак застаецца верным аднойчы абранай тэме, аднак не паўтарае ў яе раскрыцці сябе ранейшага: першапачаткова амаль што паганскі погляд з часам узбагачаецца элементамі навуковага пазнання, пазней вершы набываюць усё большую філасафічнасць і медытацыйнасць і ўрэшце (пра гэта яскрава сведчаць вершы кнігі) – рэлігійнае асвятленне. Паганскі і хрысціянскі пачаткі не супярэчаць адзін аднаму, а зусім арганічна спалучаюцца ў натурфіласофскай лірыцы апошняга дзесяцігоддзя. Па словах пісьменніка, “увага да біблійна-хрысціянскай вобразнасці – з’ява той прыроды, што і схільнасць да анімізму: гэта творчае набліжэнне да сутнасных каранёў, да асноў быцця, да яго вытокаў. Прырода – калыска чалавека фізічная, Біблія – духоўная”[2]. На ўлонні прыроды, як у храме, мастак атрымлівае магчымасць “зямны скасаваць настрой: / Застацца з сабою сам-насам”, ачысціцца і супакоіцца (“Калі маўчаць дрэвы…”).

Прыходжу да свяцілішча ляснога,
Нібы пад усявышнія пакровы, –
Шукаць паразуменне і падмогу,
Апірышча, спагаду і ахову.

“Прыходжу да свяцілішча ляснога...”

У творах натурфіласофскай лірыкі раскрываецца асаблівы дар В.Зуёнка – мысленне ва унісон са светам прыроды, – які, увасобіўшыся ў слове, стаў вызначальнай рысай і адметнасцю паэтычнага стылю гэтага аўтара.

Мастацка-вобразная палітра творчасці В.Зуёнка на памежжы стагоддзяў значна ўзбагацілася за кошт вершаў роздумаў над “вечнымі” пытаннямі. Паэт спрабуе прыўзняць заслону невядомага: “Божа, адкрый мне сакрэт: / А што далей – за Сусветам?” (“Я разумею: сусвет…”). Ключавымі ў разуменні яго светапогляднай пазіцыі паўстаюць паняцці “жыццё – смерць”, “быццё – небыццё”, “час – вечнасць”, “святасць – грэх”. Філасофскія вершы маюць выразную рэлігійную падсветку: часта гэта вельмі асабістыя звароты да Усявышняга, маленні-просьбы даць духоўнай моцы, дапамагчы захаваць веру, не заблытацца ў падмане і несправядлівасці сучаснага жыцця: “Божа, у гэтым свеце пакутным, / У гэтым хаосе сусветнай ілжы / Перад табою не дай быць адсутным, – / Божа, паверыць дапамажы…” (“Божа, у гэтым свеце пакутным…”). Простыя па форме творы ўражваюць сваёй зместавай глыбінёй і ўспрымаюцца як адкрыццё – адкрыццё не толькі для аўтара, але і для чытача. Многія паэтычныя радкі прэтэндуюць на тое, каб стаць афарызмамі:

Ці самы грэшнік, ці самы святы –
З душой, як жаўрук на праталінцы,
Да Бога спрадвеку толькі на “ты” –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ніхто на “вы” не звяртаецца.

“Я знаю: малітвы такія ёсць…”

На новым этапе творчасці актуалізуецца вядомы па ранейшых зборніках вобраз паэта-змагара: “Вечна: гэткі парадак – / Са штыком і пяром… / І пакуль будзе ўлада – / Творцу быць змагаром” (“Вечна…”). Паэзія, па перакананні В.Зуёнка, свабодная ад усіх законаў, акрамя законаў мастацтва. “Апроч паэзіі – я вольны ад усіх”, – заяўляе пісьменнік, і праўдзівасць гэтых слоў выверана жыццём. Літаратурным крэда пісьменніка і лейтматывам яго творчасці з самага пачатку была адказнасць за кожнае слова. У вершах “Я не магу, мне цяжка растлумачыць…”, “Ніколі нявольным не быў паэт…”, “Я не гандляр…” і інш. рэалізуецца матыў непрадажнасці, непадкупнасці паэзіі.

Пасля больш чым чатырох дзесяцігоддзяў творчай працы В.Зуёнак дакладна ўсведамляе сваё месца ў літаратуры, ведае сабе цану. У творах на так званую тэму мастака і мастацтва выяўляецца адчуванне асабістых годнасці і гонару. Аднак важна падкрэсліць, што гэтае адчуванне не мае нічога агульнага з самазадаволенасцю. У вершы “«Я последний поэт деревни»…” В.Зуёнак з уласцівым яму гумарам разважае пра магчымасць розных шляхоў у творчасці, падкрэслівае сваю прывязанасць да “вясковай” сцяжыны і, абыгрываючы ясенінскі выраз, зазначае: “Спынім жарты на гэтай кропцы: / Хоць “последний” – ды не апошні!..” (Дарэчы, падобныя ўдалыя каламбуры, гульню са словам знаходзім і ў многіх вершах кнігі.)

Можна гаварыць пра інтэртэкстуальнасць значнай часткі лірыкі, прадстаўленай у зборніку: шырока выкарыстоўваюцца такія мастацкія прыёмы, як рэмінісцэнцыя і алюзія. У гэтых адносінах паэзія В.Зуёнка – як і шматлікія ўзоры сучаснай літаратуры, увогуле постіндустрыяльнага мастацтва – элітарная па сваёй сутнасці: нягледзячы на тое, што аўтар ашчадна і арганічна ўводзіць элементы іншых тэкстаў ва ўласны, не злоўжывае імі, не кожны расчытае паэтычнае паведамленне, убачыць закладзеныя ў яго сэнсы, зразумее падтэксты. Адсылкамі да творчасці класікаў – Пушкіна, Ясеніна, Міцкевіча і, напэўна, найбольш Купалы, а таксама да біблійных тэкстаў – пісьменнік актывізуе чытача, апелюе да яго ведаў, робіць яго сатворцам, але перадусім выяўляе асабістыя прыхільнасці, сцвярджае свае прыярытэты ў літаратурным свеце.

У кнігу ўвайшлі прысвячэнні А.Вялюгіну, Г.Бураўкіну, Н.Гілевічу, С.Законнікаву, А.Пісьмянкову і інш., нярэдка навеяныя паэтычнымі радкамі сабратаў па пяру. В.Зуёнак высока цэніць творчасць калег, многіх з якіх ён памятае яшчэ юнакамі – прыемным і кранальным успамінам пра студэнцкае жыццё выступае верш “Прышэсце”:

Калі адлічыць паўстагоддзя назад –
Хоць час не валодае цудам вяртання,
Усё ж паспрабуем, – і зноў інтэрнат

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Філфакаўскі наш на Бабруйскай паўстане.
<…>
Калі на асфальце сена касіў
Стральцоў з цыгарэткаю інтэлігенцкай,
А сам палачанін – таму й не прасіў
Бураўкін па-княску сабе індульгенцый;
Калі дарога праз лес вяла
Сачанку крокам мініятуры,
Калі Сіпакоў зразумеў, што з сяла
Шлях самы кароткі ў літаратуру;
Калі над старонкай пакутна карпеў
І стыль глянцаваў і ваксіў Адамчык…–
Тады беларускім гімнам той спеў
І грымнуў! – раз-два! – і ў дамкі:
Ці верш, ці балада, ці прозы сувой, –
Размах, шырыня і веліч!..
І хоць не з Бабруйскай, а ў дошку свой, –
То быў – і ёсць! – КАРАТКЕВІЧ!..

Для паэта У.Караткевіч з’яўляецца ідэалам творцы – яму зразумелая і блізкая “бяздонная трывога” гэтага пісьменніка “за ўсе мільярды двухногіх”. Нягледзячы на сталасць і жыццёвы вопыт, В.Зуёнак шмат у чым застаецца такім жа рамантыкам і максімалістам, якім быў і У.Караткевіч: “Без кансерваторыі і філармоніі – / З Янкам Купалам, а то й самапасам, – / Рашаю праблему вечнай гармоніі / Ў сусвеце і ў сэрцы ўласным. <…> / Хачу хоць раз людзей ашчасліваць, / Каб не блукалі бязмэтна, / Каб не бадзяліся мітусліва, / А крочылі шляхам светлым” (“Праблема Зуёнка”).

Чым можа “людзей ашчасліваць” паэт? Вядома ж, словам – шчырым, адзіна патрэбным, што адкрылася толькі яму. Новая кніга В.Зуёнка для не абыякавых да мастацтва магла б стаць яшчэ адной магчымасцю судакрануцца з Паэзіяй. Аднак на гэты момант становішча яе няпэўнае, прамежкавае паміж небыццём і рэальнасцю:

Паэзія ў бязмежжы небыцця, –
Я сам не разумею, што твару:
Які пачатак і які працяг,
Якому дар нясу гаспадару?

Скажы, камп’ютар, цэрбер мой нямы,
Ці чуеш словы, дзе маёй душой

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ты набрынялы, на яе правы
Закляў, здаецца, небам і зямлёй.

Прабач, хаўруснік, тэхніка твая
Што ёсць супраць адной маёй слязы?
Ты віртуальнасць небыцця – а я? –
Няўжо драбней касмічнай драбязы?..

О не – я гэткай згоды не даю
Быць віртуальным, покуль я жывы.
Няхай на грані небыцця стаю –
Але мой шлях сусветна-крыжавы!..

“Камп’ютар”

…“Кніга з камп’ютарнага небыцця” – так акрэсліў фармат гэтага збору вершаў сам В.Зуёнак. “Віртуальнасць”, нематэрыялізаванасць у звычайным, папяровым выглядзе, аднак, не адмяняе яе (кнігі) нараджэння і самастойнага існавання як не праходной з’явы ў беларускай літаратуры пачатку XXI стагоддзя. Ніводзін з тых, хто знаёмы з нязменна глыбокімі, па-майстэрску дасканалымі, вельмі асабістымі і адначасова сацыяльна значнымі творамі выдатнага пісьменніка, – ранейшымі і сабранымі ў зборніку “Азірнуўшыся, не скамянець,” – не ўсумніцца ў іх сапраўднасці. Лёс жа сапраўднай паэзіі, урэшце, вырашаюць не функцыянеры і мецэнаты ад літаратуры, а вялікі час. І жыццё такой паэзіі – вечнасць.

---

[1] Зуёнак, В. Азірнуўшыся, не скамянець: вершы сутоку тысячагоддзяў / В.Зуёнак. – Электр. дадз. (3,4 Мб). Далей цытаты падаюцца па камп’ютарнай версіі кнігі (аўтарскі варыянт).

[2] Зуёнак, В. Паэту насцеж адкрыты свет...: [гутарка Н.Заяц з В.Зуёнкам] / В.Зуёнак // Роднае слова. – 2003. – № 6. – С. 99.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ